Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
________________А.І.Жук
«_20_» _06_ ______2025 г.

Рэгістрацыйны № УД-_31-2-118_/вуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура)**

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі, зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), зацверджанага 23.02.2023, рэг. № 048 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІК:**

У.П.Саўко, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

С.А.Шантаровіч, дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

А.У.Перавозны, дацэнт кафедры педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар ДУА «Сярэдняя школа № 1 г. Мінска імя В.П.Чкалава» _______________ У.А.Сняжкоў

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 10 ад 22.05.2025 г.)

Загадчык кафедры _______________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 5 ад 17.06.2025 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела _______________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі _______________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура).

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

Мэта вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» – тэарэтычная і практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў якасці настаўніка беларускай мовы ў навучальных установах featured рознага тыпу.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

– пазнаёміць студэнтаў з мэтай, задачамі, прынцыпамі, метадамі, сродкамі, формамі арганізацыі навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, са зместам і структурай школьнага курса беларускай мовы;

– фарміраваць у студэнтаў уменні планаваць вучэбны працэс, распрацоўваць канспекты ўрокаў розных тыпаў, падбіраць неабходны дыдактычны матэрыял для канкрэтнага ўрока;

– фарміраваць элементарныя ўменні правядзення ўрокаў розных тыпаў з выкарыстаннем разнастайных метадаў і прыёмаў навучання;

– садзейнічаць падрыхтоўцы студэнтаў да выканання функцый настаўніка беларускай мовы.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.**

Вучэбная дысцыпліна адносіцца да модуля «Метадычная падрыхтоўка» дзяржаўнага кампанента.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы» звязана з наступнымі вучэбнымі дысцыплінамі: «Асновы псіхалогіі і педагогікі», «Педагогіка».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць**:

– мэту, змест, прынцыпы, метады, сродкі і арганізацыйныя формы навучання вучняў беларускай мове;

– методыку развіцця звязнага маўлення вучняў;

– патрабаванні да арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці настаўніка беларускай мовы;

**умець**:

– планаваць і арганізоўваць навучальны працэс па прадмеце;

– распрацоўваць разгорнутыя канспекты ўрокаў, праводзіць розныя тыпы ўрокаў беларускай мовы;

– бачыць пераемнасць і перспектыўнасць у навучанні;

**мець навыкі**

– вызначаць і вырашаць дыдактычныя, развіццёвыя і выхаваўчыя задачы ўрокаў беларускай мовы; адбіраць вучэбны матэрыял па адпаведных раздзелах школьнага курса беларускай мовы;

– абгрунтавана выкарыстоўваць розныя тыпы ўрокаў, формы, метады і прыёмы навучання.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступных кампетэнцый:

УК-6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змен у прафесійнай дзейнасці

БПК-1. Праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці.

БПК-5. Ажыццяўляць адбор зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца:

для вочнай (дзённай) формы атрымання вышэйшай адукацыі – 108 гадзін, з іх 48 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 24 гадзіны, практычныя заняткі – 24 гадзіны, самастойная (пазааўдыторная) работа – 60 гадзін.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны – 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме экзамену ў 5-м семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы

### 1.1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука

Методыка выкладання беларускай мовы як навука, яе прадмет, змест, задачы. Фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі беларускай мовы: мэты і змест моўнай адукацыі, працэс навучання мове, заканамернасці засваення мовы, прынцыпы навучання, метады, прыёмы і формы навучання, адукацыйная тэхналогія, моўная, маўленчая і этнакультурная кампетэнцыі**.**

Сувязь методыкі беларускай мовы з іншымі навукамі: філасофіяй, педагогікай, псіхалогіяй, лінгвістыкай, псіхалінгвістыкай і інш.

### 1.2. Беларуская мова як вучэбны прадмет ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

Беларуская мова – прадмет вывучэння, сродак навучання, фарміравання і развіцця асобы вучня. Мэта і задачы навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Змест і структура школьнага курса беларускай мовы.

Вучэбная праграма па беларускай мове для 5–11-х класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі: яе накіраванасць, структура, змест, прынцыпы пабудовы. Арыентацыя праграмы на развіццё маўленчых і інтэлектуальных здольнасцей вучняў, асэнсаванне імі законаў мовы, фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў, выхаванне школьнікаў. Асноўныя кампаненты праграмы, іх характарыстыка.

### 1.3. Прынцыпы навучання беларускай мове

Паняцце “прынцып навучання”. Агульнадыдактычныя і агульнаметадычныя прынцыпы навучання беларускай мове.

Агульнаметадычныя (прадметнаарыентаваныя) прынцыпы навучання роднай мове: функцыянальнай накіраванасці, камунікатыўнай накіраванасці, структурна-семантычны, апоры на этнакультуру, улік фактару бікультурнага развіцця асобы вучня і інш.

### 1.4. Сродкі навучання беларускай мове

Сродкі навучання беларускай мове як метадычнае паняцце. Класіфікацыя сродкаў навучання беларускай мове.

Падручнік – асноўны сродак навучання беларускай мове. Узаемасувязь праграмы і падручніка. Функцыі падручніка: інфармацыйная, трансфармацыйная, сістэматызавальная, выхаваўчая і інш. Структурныя кампаненты школьных падручнікаў. Характарыстыка сучасных падручнікаў па беларускай мове: формы падачы новага матэрыялу, сістэма практыкаванняў і заданняў, сістэма паўтарэння вывучанага, метадычны апарат.

Дапаможнікі і матэрыялы, што дапаўняюць падручнік (зборнікі практыкаванняў, слоўнікі, даведнікі і інш.), і іх выкарыстанне ў навучальным працэсе.

### 1.5. Метады навучання беларускай мове

Паняцце метаду навучання. Класіфікацыя метадаў навучання. Характарыстыка найбольш пашыраных і прызнаных метадычнай навукай і школьнай практыкай метадаў навучання (паведамленне настаўніка, гутарка, лекцыя, назіранне і моўны аналіз, лінгвістычны эксперымент, чытанне падручніка, моўны разбор, практыкаванні і інш.).

Выкарыстанне метадаў навучання ў залежнасці ад мэт урока, зместу моўнага матэрыялу, узросту і ступені падрыхтаванасці школьнікаў.

### 1.6. Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура

Урок як асноўная арганізацыйна-педагагічная форма навучання і выхавання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Сучасныя патрабаванні да ўрока беларускай мовы. Структурныя кампаненты ўрока мовы і іх функцыі.

Тыпы ўрокаў роднай мовы: урок вывучэння новага матэрыялу; урок замацавання ведаў, уменняў і навыкаў; урок паўтарэння і абагульнення вывучанага; камбінаваны ўрок; урок развіцця звязнага маўлення (навучання перакладам, пераказам, сачыненням); урокі кантролю; урокі аналізу пісьмовых прац.

Падрыхтоўка настаўніка да ўрока мовы. Планаванне вучэбнага матэрыялу. Віды вучэбных планаў: каляндарна-тэматычны, паўрочны.

Умовы эфектыўнага правядзення ўрока роднай мовы. Аналіз урока беларускай мовы.

### 1.7. Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы

Асноўныя патрабаванні да арганізацыі кантролю ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па беларускай мове. Функцыі, формы, метады кантролю. Нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

## Раздзел 2. Методыка вывучэння раздзелаў курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі

### 2.1. Методыка навучання арфаграфіі

Мэты навучання арфаграфіі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест навучання арфаграфіі. Арфаграфічныя ўменні і навыкі. Псіхалагічныя і метадычныя ўмовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.

Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення.

Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7-х класах. Развіццё арфаграфічных уменняў у 8–9-х і 10–11-х класах.

Праверка пісьмовых прац вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Методыка работы над арфаграфічнымі памылкамі на ўроках мовы.

### 2.2. Методыка навучання пунктуацыі

Мэты навучання пунктуацыі, яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Змест і этапы навучання пунктуацыі. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.

Азнаямленне вучняў з пунктуацыйнымі паняццямі (пунктаграма, пунктуацыйна-сэнсавы адрэзак), методыка работы над пунктуацыйным правілам. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення.

### 2.3. Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі і граматыкі

Мэты і змест вывучэння фанетыкі, лексікі і граматыкі. Прынцыпы методыкі вывучэння раздзелаў навукі аб мове. Методыка азнаямлення вучняў з моўнымі з’явамі. Практыкаванні на фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў пры вывучэнні фанетыкі, лексікі і граматыкі.

## Раздзел 3. Методыка развіцця звязнага маўлення вучняў

### 3.1. Пераказ ў сістэме работы па развіцці звязнага маўлення вучняў

Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Класіфікацыя пераказаў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па спосабу перадачы зместу зыходнага тэксту (падрабязныя, (поўныя), блізкія да тэксту, сціслыя, выбарачныя, з дадатковым заданнем) і інш.

Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў.

### 3.2. Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў

Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення, сродак самавыражэння асобы вучня, яго жыццёвай пазіцыі, унутранага свету. Класіфікацыя сачыненняў: па мэце правядзення (навучальныя і кантрольныя), па месцы выканання (класныя і дамашнія), па крыніцы атрымання ведаў (на аснове жыццёвага вопыту, асабістых назіранняў і ўражанняў; па карціне; на літаратурныя і вольныя тэмы і інш.), па тыпу тэксту (апавяданні, апісанні, разважанні, апавяданні з элементамі апісання і інш.), па жанру (артыкул у газету, водгук, рэцэнзія і г.д.) і інш.

Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў.

**3.3. Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў**

Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу.

Методыка правядзення перакладаў.

**3.4. Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў**

Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Нормы ацэнкі творчых прац .

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная праца | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя | | | |
| | **Методыка выкладання беларускай мовы** | **24** | **24** | **60** | | |
| **1** | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **10** | **10** | | | |
| 1.1 | **Методыка выкладання беларускай мовы як навука**<br>Методыка выкладання беларускай мовы як навука, яе прадмет, змест, задачы. Сувязь методыкі беларускай мовы з іншымі навукамі. | 1 | | 2 | 2, 9(д) | Аналіз вучэбнага дапаможніка па методыцы |
| 1.2 | **Беларуская мова як вучэбны прадмет ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі**<br>Мэта і задачы навучання беларускай мове. Змест і структура школьнага курса. Вучэбная праграма па беларускай мове для 5–11-х класаў. | | 1 | 2 | 2, 9(д) | Аналіз вучэбнай праграмы |
| 1.3 | **Прынцыпы навучання беларускай мове**<br>Паняцце “прынцып навучання”. Агульнадыдактычныя і агульнаметадычныя прынцыпы навучання беларускай мове. | 1 | | 2 | 2, 9(д) | Падрыхтоўка табліцы |
| 1.4 | **Сродкі навучання беларускай мове**<br>Класіфікацыя сродкаў навучання беларускай мове. Падручнік – асноўны сродак навучання беларускай мове. Функцыі і структурныя кампаненты падручнікаў. | | 1 | 2 | 1, 2 | Аналіз падручнікаў па беларускай мове |
| 1.5 | **Метады навучання беларускай мове**<br>Паняцце метаду навучання. Класіфікацыя метадаў навучання. Характарыстыка найбольш пашыраных метадаў навучання. | 2 | 2 | 4 | 2, 11(д) | Мадэляванне метадаў навучання |
| 1.6 | **Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура**<br>Урок як асноўная форма навучання і выхавання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Структурныя кампаненты ўрока мовы і іх функцыі. Тыпы ўрокаў беларускай мовы. Аналіз урока беларускай мовы. Віды вучэбных планаў. | 4 | 4 | 6 | 2, 11(д) | Разгорнуты канспект урока |
| 1.7 | **Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы** | 2 | 2 | 4 | 7(д), | Канспект |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Функцыі, формы, метады кантролю. Нормы ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў па беларускай мове. | | | | 8(д) | нарматыўнага дакумента |
| **2** | **Методыка вывучэння раздзелаў курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі** | **10** | **8** | | | |
| 2.1 | **Методыка навучання арфаграфіі**<br>Мэты і змест навучання арфаграфіі. Арфаграфічныя ўменні і навыкі. Прынцыпы методыкі арфаграфіі. Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам. Арфаграфічныя практыкаванні, іх віды, методыка правядзення. Праверка пісьмовых прац вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. | 4 | 4 | 6 | 2, 4(д), 5(д) | Кантрольная работа |
| 2.2 | **Методыка навучання пунктуацыі**<br>Мэты і змест навучання пунктуацыі. Прынцыпы методыкі пунктуацыі. Азнаямленне вучняў з пунктуацыйнымі паняццямі, методыка работы над пунктуацыйным правілам. Фарміраванне пунктуацыйных уменняў і навыкаў. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення. | 2 | 2 | 6 | 2, 9(д) | Кантрольная работа |
| 2.3 | **Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі і граматыкі**<br>Мэты і змест вывучэння фанетыкі, лексікі і граматыкі. Прынцыпы методыкі вывучэння раздзелаў навукі аб мове. Методыка азнаямлення вучняў з моўнымі з’явамі. Практыкаванні на фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў пры вывучэнні фанетыкі, лексікі і граматыкі. | 4 | 2 | 6 | 1, 2(д), 3(д), 6(д), 10(д) | Мультымедыйная прэзентацыя табліц, схем, кластараў |
| **3** | **Методыка развіцця звязнага маўлення вучняў** | **4** | **6** | | | |
| 3.1 | **Пераказ ў сістэме работы па развіцці звязнага маўлення вучняў**<br>Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення школьнікаў. Класіфікацыя пераказаў. Методыка правядзення навучальных і кантрольных пераказаў. | 2 | 2 | 4 | 2, 1(д), 9(д) | Прэзентацыя вынікаў аналізу вучэбных праграм |
| 3.2 | **Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў**<br>Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення. Класіфікацыя сачыненняў. Спосабы падрыхтоўкі да сачынення. Методыка правядзення сачыненняў. | 2 | | 4 | 2, 1(д), 9(д) | Прэзентацыя вынікаў аналізу вучэбных праграм |
| 3.3 | **Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў**<br>Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу. Методыка правядзення перакладаў. | | 2 | 6 | 2, 1(д), 9(д) | Прэзентацыя дыдактычнага матэрыялу |
| 3.4 | **Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў**<br>Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак. Нормы ацэнкі творчых прац. | | 2 | 6 | 7 (д), 8 (д) | Аналіз нарматыўных дакументаў |
| | **Усяго** | **24** | **24** | **60** | | **Экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Ляшчынская, В. А. Методыка выкладання беларускай мовы. Заданні і практыкаванні : вучэб. дапам. / В. А. Ляшчынская, З. У. Шведава. – Мн. : Рэсп. ин-т выш. шк., 2015. – 212 с.
2. Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасці 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад. У. П. Саўко // Репозиторий БГПУ. – URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/6319 (дата звароту: 09.04.2025).

**Дадатковая літаратура**

1. Валочка, Г. М. Тэарэтыка-метадычныя асновы развіцця звязнага маўлення вучняў на ўроках беларускай мовы : 5–10 кл. / Г. М. Валочка. – Мн. : Нац. ін-т адукацыі, 2005. – 201 с.
2. Выгонная, Л. Ц. Фанетыка беларускай мовы ў школе / Л. Ц. Выгонная. – Мн. : Нар. асвета, 1995. – 236 с.
3. Даніловіч, М. А. Вывучэнне фразеалогіі на ўроках мовы / М. А. Даніловіч. – Мн. : Нар. асвета, 1991. – 94 с.
4. Зелянко, В. У. Навучанне арфаграфіі беларускай мовы ў 5–11 класах: тэорыя і практыка : манаграфія / В. У. Зелянко. – Мн. : ИВЦ Минфина, 2016. – 194 с.
5. Казлова, А. У. Карэкцыйная работа на ўроках беларускай мовы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / А. У. Казлова. – Мазыр : Выснова, 2019. – 73 с.
6. Лаўрэль, Я. М. Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я. М. Лаўрэль, Т. Р. Новікава, С. А. Язерская. – Мн. : Нар. асвета, 1991. – 158 с.
7. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі : зацв. нам. Міністра адукацыі Рэсп. Беларусь 21 жніўня 2023 г. // Национальный образовательный портал. – URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html (дата звароту: 09.04.2025).
8. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам : утв. зам. Министра образования Респ. Беларусь 15 сент. 2022 г. : в ред. 30 авг. 2024 г. // Национальный образовательный портал. – URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-

protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html (дата обращения: 09.04.2025).

9. Методыка выкладання беларускай мовы : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі, Г. М. Валочка, Л. С. Васюковіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.

10. Саўко, У. П. Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі (назоўніка і прыметніка) / У. П. Саўко. – Мн. : Беллітфонд, 2000. – 107 с.

11. Яленскі, М. Г. Методыка выкладання беларускай мовы : практыкум : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі, У. П. Саўко, Л. С. Васюковіч ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мн. : Адукацыя і выхаванне, 2006. – 336 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТА ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

Эфектыўнасць самастойнай работы студэнтаў правяраецца падчас бягучага і прамежкавага кантролю ведаў. Для агульнай ацэнкі якасці засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваецца рэйтынгавая сістэма.

Для павышэння якасці прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў-філолагаў мэтазгодна прыцягваць кожнага студэнта да сістэматычнай самастойнай работы. Крыніцамі інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць быць канспекты лекцый і вучэбныя дапаможнікі па методыцы выкладання беларускай мовы (http://elib.bspu.by/handle/doc/6319), вучэбныя праграмы і вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі (https://e-padruchnik.adu.by/), нарматыўныя дакументы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, метадычныя дапаможнікі для настаўнікаў беларускай мовы, навукова-метадычныя часопісы, зборнікі дыдактычных матэрыялаў па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, матэрыялы Нацыянальнага адукацыйнага партала (https://adu.by) і інш.

## Пералік і сціслая характарыстыка ацэначных сродкаў (АС)

| № п/п | Назва АС | Кароткая характарыстыка ацэначнага сродку | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1 | Рознаўзроў-невыя заданні | – Заданні рэпрадуктыўнага ўзроўню, якія дазваляюць ацэньваць і дыягнасціраваць веданне фактычнага матэрыялу, уменне правільна выкарыстоўваць тэрміны і паняцці ў межах пэўнага раздзела дысцыпліны.<br>– Заданні рэканструктыўнага ўзроўню, якія дазваляюць ацэньваць і дыягнасціраваць уменні аналізаваць фактычны матэрыял з фармуляваннем канкрэтных высноў.<br>– Заданні творчага ўзроўню, якія дазваляюць ацэньваць і дыягнасціраваць веды з розных абласцей, уменні творча прымяняць гэтыя веды пры вырашэнні метадычных задач. | Прыкладныя пытанні і заданні да рэйтынгавых кантрольных работ.<br>Пералік нарматыўных дакументаў для аналізу і канспектавання.<br>Спасылкі на электронныя версіі вучэбных праграм і вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове. |
| 2 | Творчае заданне | Часткова рэгламентаванае заданне, якое дазваляе дыягнасціраваць веды і ўменні, набытыя падчас вывучэння дысцыплін педагагічнага і метадычнага модуляў. Выконваецца ў індывідуальным парадку | Прыкладныя тэмы разгорнутых канспектаў урокаў |
| 3 | Мультыме-дыйная прэзентацыя | Прадстаўленне рашэння вучэбнай задачы з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій | Прыкладныя заданні для мадэлявання табліц, схем, кластараў па |

| № п/п | Назва АС | Кароткая характарыстыка ацэначнага сродку | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| | | | разделах школьнага курса беларускай мовы з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі |
| 4 | Тэст | Сістэма фармалізаваных заданняў, па выніках выканання якіх можна меркаваць аб узроўні валодання ведамі, уменнямі і навыкамі. | Прыклады тэставых заданняў |

Час, адведзены на самастойную работу, можа выкарыстоўвацца навучэнцам на:

– падрыхтоўку да лекцый і практычных заняткаў;

– аналіз вучэбных праграм і вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі;

– падрыхтоўку дыдактычнага матэрыялу для правядзення ўрокаў беларускай мовы;

– мадэляванне фрагментаў урокаў беларускай мовы;

– напісанне разгорнутага канспекта ўрока беларускай мовы;

– аналіз і канспектаванне нарматыўных дакументаў, якія рэгламентуюць кантрольна-ацэначную дзейнасць настаўніка беларускай мовы;

– падрыхтоўку да напісання рэйтынгавых работ, выканання тэстаў;

– падрыхтоўку да экзамену па вучэбнай дысцыпліне.

Кантроль самастойнай работы ажыццяўляецца ў выглядзе:

– тэсціравання;

– кантрольнай работы;

– абмеркавання праведзеных фрагментаў урокаў;

– пісьмовай творчай работы “Разгорнуты канспект урока па беларускай мове”;

– дэманстрацыі падрыхтаваных дыдактычных матэрыялаў;

– канспектаў нарматыўных дакументаў.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”

Дзённая форма атрымання адукацыі

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 2 | Прааналізаваць вучэбны дапаможнік па методыцы выкладання беларускай мовы і вызначыць сувязь методыкі з іншымі навукамі | Аналіз вучэбнага дапаможніка па методыцы |
| 2 | Беларуская мова як вучэбны прадмет ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі | 2 | Прааналізаваць вучэбную праграму і вызначыць, якія раздзелы вывучаюцца ў школьным курсе беларускай мовы | Аналіз вучэбнай праграмы |
| 3 | Прынцыпы навучання беларускай мове | 2 | Падрыхтаваць табліцу на тэму “Прынцыпы навучання беларускай мове” | Падрыхтоўка табліцы |
| 4 | Сродкі навучання беларускай мове | 2 | Прааналізаваць метадычную сістэму вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі | Аналіз вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове |
| 5 | Метады навучання беларускай мове | 4 | Падрыхтаваць дэманстрацыю метадаў навучання беларускай мове | Мадэляванне метадаў навучання |
| 6 | Сучасны ўрок беларускай мовы: тыпы і структура | 6 | Напісаць разгорнуты канспект камбінаванага ўрока па беларускай мове | Разгорнуты канспект урока |
| 7 | Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы | 4 | Знайсці ў “Методических указаниях по организации контроля и оценки...” і заканспектаваць тую інфармацыю, якую павінен ведаць настаўнік беларускай мовы для ажыццяўлення кантрольна-ацэначнай дзейнасці | Канспект нарматыўнага дакумента |
| 8 | Методыка навучання арфаграфіі | 6 | Падрыхтавацца да напісання рэйтынгавай работы | Кантрольная работа |
| 9 | Методыка навучання пунктуацыі | 6 | Падрыхтавацца да напісання рэйтынгавай работы | Кантрольная работа |
| 10 | Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі і граматыкі | 6 | Падрыхтаваць табліцу (схему, кластар) па фанетыцы (лексіцы, словоўтварэнні, марфалогіі, сінтаксісе) з | Мультыме-дыйная прэзентацыя табліц, схем, |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі | кластараў |
| 11 | Пераказ у сістэме работы па развіцці звязнага маўлення | 4 | Праанілізаваць вучэбныя праграмы па беларускай мове для 5–9-х класаў і вызначыць, якія віды пераказаў павінны напісаць вучні | Прэзентацыя вынікаў аналізу вучэбных праграм |
| 12 | Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення | 4 | Праанілізаваць вучэбныя праграмы па беларускай мове для 5–11-х класаў і вызначыць, якія віды сачыненняў павінны напісаць вучні | Прэзентацыя вынікаў аналізу вучэбных праграм |
| 13 | Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў | 6 | Падабраць дыдактычны матэрыял для правядзення перакладу ў пэўным класе | Прэзентацыя дыдактычнага матэрыялу |
| 14 | Ацэнка камунікатыўнай пісьменнасці вучняў | 6 | 1. Знайсці ў “Метадычных рэкамендацыіях па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення...” і вывучыць тыпалогію памылак у творчых працах вучняў.<br>2. Знайсці ў “Методических указаниях по организации контроля и оценки...” тую інфармацыю, якую павінен ведаць настаўнік беларускай мовы для ацэнкі камунікатыўнай пісьменнасці вучняў | Аналіз нарматыўных дакументаў |
| | **Усяго** | **60** | | |

# ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

## Кантрольная рэйтынгавая работа № 1

1. Сфармулюйце асноўную і прыватныя задачы навучання арфаграфіі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Пералічыце этапы, на якіх гэтыя задачы вырашаюцца.

2. Якія ўмовы фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў вы ведаеце? У чым іх сутнасць?

3. Дайце азначэнне паняццю “арфаграма”. У якой паслядоўнасці адбываецца азнаямленне з арфаграмай, арфаграфічным правілам?

4. Ахарактарызуйце спісванне як від арфаграфічнага практыкавання.

5. Раскажыце пра методыку правядзення папераджальнага і выбарачнага дыктантаў.

6. Ахарактарызуйце слоўнікавы дыктант як від арфаграфічнага практыкавання.

7. Раскажыце пра методыку правядзення тлумачальнага дыктанта. У чым сутнасць дыктанта “Правяраю сябе?”

8. Пералічыце неспецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні. Раскажыце пра методыку правядзення вольнага і творчага дыктантаў.

9. Якім патрабаванням павінен адпавядаць тэкст кантрольнага дыктанта? Як праводзіцца кантрольны дыктант?

10. Раскажыце пра методыку работы над памылкамі на ўроках беларускай мовы.

## Кантрольная рэйтынгавая работа № 2

1. Якія памылкі не ўлічваюцца пры ацэнцы кантрольных работ і не выносяцца на палі?

2. Якія памылкі адносяцца да аднатыпных? Як яны ўлічваюцца пры ацэнцы пісьмовых работ?

3. Якія арфаграфічныя памылкі адносяцца да нягрубых? Пералічыце іх.

4. Ці ўплывае на адзнаку наяўнасць у пісьмовай рабоце выпраўленняў?

5. Сфармулюйце мэту і задачы навучання пунктуацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

6. Назавіце этапы вывучэння пунктуацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Якія веды па пунктуацыі атрымліваюць вучні на кожным з гэтых этапаў?

7. Пры якіх умовах адбываецца паспяховае засваенне вучнямі пунктуацыйных нормаў?

8. Дайце азначэнне паняццям “пунктаграма”, “пунктуацыйнае правіла”. Якія этапы выдзяляюцца ў працы над пунктуацыйным правілам?

9. Якія практыкаванні выкарыстоўваюцца для фарміравання пунктуацыйных уменняў вучняў?

# ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭМЫ РАЗГОРНУТЫХ КАНСПЕКТАЎ КАМБІНАВАНЫХ УРОКАЎ

1. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікамі (5 клас).
2. Азначэнне (5 клас).
3. Акалічнасць (5 клас).
4. Устарэлыя словы (5 клас).
5. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (5 клас).
6. Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя (6 клас).
7. Нескланяльныя назоўнікі (6 клас).
8. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне (6 клас).
9. Простыя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс (6 клас).
10. Скланенне, ужыванне і правапіс парадкавых лічэбнікаў (6 клас).
11. Скланенне, ужыванне і правапіс зборных лічэбнікаў (6 клас).
12. Пераходныя і непераходныя дзеясловы (7 клас).
13. Трыванні дзеяслова (7 клас).
14. Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку (7 клас).
15. Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка (7 клас).
16. Правапіс *не (ня)* з дзеепрыметнікамі (7 клас).
17. Ступені параўнання прыслоўяў (7 клас).
18. Прыназоўнікі простыя, складаныя і састаўныя, іх ужыванне і правапіс (7 клас).
19. Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне (7 клас).
20. Віды падпарадкавальнай сувязі ў словазлучэнні: дапасаванне, кіраванне, прымыканне (8 клас).
21. Састаўны дзеяслоўны выказнік  (8 клас).
22. Састаўны іменны выказнік (8 клас).
23. Прыдатак як разнавіднасць азначэння (8 клас).
24. Безасабовыя сказы (8 клас).
25. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах (9 клас).
26. Складаназалежныя сказы з даданай дапаўняльнай часткай (9 клас).

## ПРЫКЛАДНЫЯ ЗАДАННІ ДЛЯ МАДЭЛЯВАННЯ ТАБЛІЦ, СХЕМ, КЛАСТАРАЎ З ВЫКАРЫСТАННЕМ МУЛЬТЫМЕДЫЙНАЙ ПРЭЗЕНТАЦЫІ

Падрыхтуйце з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі табліцу па тэме “Спосабы словаўтварэння”.

Падрыхтуйце з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі табліцу па тэме “Галоўныя і даданыя члены сказа”.

Падрыхтуйце з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі схему па любой тэме раздзела “Лексіка”.

Падрыхтуйце з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі схему па тэме “Зычныя і галосныя гукі”.

Падрыхтуйце з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі кластар па тэме “Прыметнік як часціна мовы”.

Падрыхтуйце з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі кластар па тэме “Складаныя сказы”.

## ПЕРАЛІК НАРМАТЫЎНЫХ ДАКУМЕНТАЎ ДЛЯ АНАЛІЗУ І КАНСПЕКТАВАННЯ

1. Методические указания по организации контроля и оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, применению норм оценки результатов учебной деятельности учащихся по учебным предметам [Электронны рэсурс] – URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html

2. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс]. – URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/metodicheskie-rekomendatsii-ukazaniya.html

## СПАСЫЛКІ НА ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЕРСІІ ВУЧЭБНЫХ ПРАГРАМ І ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

1. Вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для V–XI класаў установаў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны рэсурс]. – URL: https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-mova.html

2. Вучэбныя дапаможнікі па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для V–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны рэсурс]. – URL: https://e-padruchnik.adu.by/

## ПРЫКЛАДЫ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ

1. Прыватнаметадычнымі прынцыпамі вывучэння фанетыкі з’яўляюцца:
1) структурна-семантычны;
2) апоры на маўленчы слых вучняў;
3) разгляду гука ў марфеме;
4) супастаўлення гукаў і літар.

2. Асноўны этап вывучэння марфемікі і словаўтварэння прыпадае на:
1) 5 клас:
2) 6 клас;
3) 7 клас;
4) 8 клас.

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для дыягностыкі кампетэнцый выкарыстоўваюцца наступныя формы:

1. Вусная форма: індывідуальнае і франтальнае апытванне, вусны аналіз метадычнага матэрыялу, вусны адказ на экзамене і інш.

2. Пісьмовая форма: кантрольныя работы, мадэляванне фрагмента ўрока, падрыхтоўка дыдактычнага матэрыялу, табліц, схем, кластараў, напісанне разгорнутага канспекта урока, канспектаване нарматыўнага дакумента, тэсціраванне.

3. Вусна-пісьмовая форма: справаздача па практычным дамашнім заданні з яго вуснай абаронай.

Крытэрыямі ацэнкі выканання студэнтамі работ па вучэбнай дысцыпліне “Методыка выкладання беларускай мовы” з’яўляюцца:

– узровень засваення вучэбнага матэрыялу;

– уменне выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры вырашэнні практычных задач;

– правільнасць і паўната адказу, наяўнасць прыкладаў, дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, правільнае маўленчае афармленне адказу;

– узровень сфарміраванасці ўменняў ажыццяўляць аналіз дыдактычнага матэрыялу па раздзелах школьнага курса беларускай мовы, нарматыўных дакументаў;

– узровень сфарміраванасці ўменняў самастойна падбіраць і канструяваць дыдактычны матэрыял па лінгвістычнай тэме, мадэляваць фрагмент урока па беларускай мове;

– правільнасць падбору і структуравання лінгвістычнага матэрыялу для ўрока пэўнага тыпу па адпаведным раздзеле школьнага курса беларускай мовы; афармленне канспекта ўрока ў адпаведнасці з метадычнымі патрабаваннямі; уменне праводзіць урок па беларускай мове.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука. Прадмет, задачы, змест методыкі беларускай мовы. Сувязь методыкі з іншымі навукамі: лінгвістыкай, педагогікай, псіхалогіяй і інш.

2. Беларуская мова як вучэбны прадмет у сучаснай школе. Мэта і задачы навучання беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі РБ. Змест і структура школьнага курса беларускай мовы.

3. Вучэбная праграма па беларускай мове для 5–11-х класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі: структура, змест, прынцыпы пабудовы. Асноўныя кампаненты праграмы, іх характарыстыка.

4. Паняцце прынцыпу навучання. Агульнаметадычныя прынцыпы навучання беларускай мове.

5. Сродкі навучання беларускай мове. Класіфікацыя сродкаў навучання. Падручнік – асноўны сродак навучання беларускай мове. Функцыі, структурныя кампаненты, метадычная сістэма падручнікаў па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

6. Метады навучання беларускай мове. Праблема класіфікацыі метадаў навучання. Характарыстыка асноўных метадаў навучання.

7. Урок як асноўная форма навучання і выхавання ў сучаснай школе. Класіфікацыя ўрокаў мовы. Структурныя кампаненты ўрока мовы і іх функцыі.

8. Тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх мэты і структура (урок вывучэння новага матэрыялу; урок замацавання ведаў, уменняў і навыкаў).

9. Тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх мэты і структура (камбінаваны ўрок; урок паўтарэння і абагульнення вывучанага).

10. Умовы эфектыўнага правядзення ўрока беларускай мовы. Аналіз урока беларускай мовы.

11. Арганізацыя вучэбнага працэсу па беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублики Беларусь. Віды вучэбных планаў. Методыка састаўлення каляндарна-тэматычнага і паўрочнага планаў.

12. Кантрольна-ацэначная дзейнасць настаўніка на ўроках беларускай мовы. Асноўныя патрабаванні да кантролю. Віды, функцыі, метады кантролю.

13. Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі РБ. Колькасць і прызначэнне вучнёўскіх сшыткаў па беларускай мове, парадак іх афармлення і вядзення. Парадак праверкі навучальных, кантрольных, экзаменацыйных работ і работ над памылкамі.

14. Методыка навучання арфаграфіі. Значэнне, задачы, этапы навучання арфаграфіі ў школе. Умовы і асаблівасці фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў. Прынцыпы методыкі арфаграфіі.

15. Паняцце аб арфаграме. Методыка азнаямлення вучняў з арфаграмай і арфаграфічным правілам.

16. Спецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (спісванне, папераджальны, тлумачальны і каменціраваны дыктанты).

17. Спецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (дыктант “Правяраю сябе”, выбарачны, слоўнікавы, камбінаваны дыктанты, пісьмо па памяці).

18. Неспецыяльныя арфаграфічныя практыкаванні, методыка іх правядзення (вольны дыктант, творчы дыктант і інш.).

19. Кантрольны дыктант. Методыка правядзення кантрольнага дыктанта.

20. Арганізацыя працы па арфаграфіі пры вывучэнні неарфаграфічных тэм у 5–7-х класах. Праца па арфаграфіі ў 8–9-х і 10–11-х класах.

21. Методыка вывучэння пунктуацыі. Мэты навучання пунктуацыі і яе месца ў школьным курсе беларускай мовы. Пунктуацыйныя ўменні. Прынцыпы методыкі пунктуацыі.

22. Методыка вывучэння пунктаграмы, пунктуацыйнага правіла.

23. Віды пунктуацыйных практыкаванняў, методыка іх правядзення.

24. Ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў: класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

25. Ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў: памылкі, якія не ўлічваюцца пры ацэнцы пісьмовых работ. Аднатыпныя памылкі.

26. Ацэнка арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці вучняў: нягрубыя арфаграфічныя памылкі.

27. Методыка работы над памылкамі на ўроках беларускай мовы. Структура ўрока работы над памылкамі (урока карэкцыі ведаў, уменняў і навыкаў).

28. Методыка вывучэння фанетыкі, лексікі, граматыкі: мэты і змест вывучэння раздзелаў навукі аб мове.

29. Прынцыпы методыкі вывучэння фанетыкі, лексікі, граматыкі.

30. Методыка азнаямлення вучняў з новымі моўнымі з’явамі (лексічнымі, фанетычнымі і інш.).

31. Віды практыкаванняў на фарміраванне вучэбна-моўных уменняў пры вывучэнні фанетыкі, лексікі і граматыкі.

32. Пераказ як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Класіфікацыя пераказаў. Методыка правядзення падрабязнага пераказу (навучальнага і кантрольнага).

33. Сціслы пераказ, методыка яго правядзення.

34. Выбарачны пераказ, методыка яго правядзення.

35. Сачыненне як від работы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Класіфікацыя сачыненняў. Спосабы падрыхтоўкі да сачыненняў.

36. Методыка правядзення сачыненняў розных відаў.

37. Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў. Класіфікацыя, улік, прыёмы выпраўлення памылак.

38. Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў: маўленчыя памылкі.

39. Ацэнка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў: граматычныя памылкі.

40. Пераклад як від навучальных практыкаванняў па развіцці маўлення вучняў. Метадычная мэтазгоднасць выкарыстання перакладу на ўроках беларускай мовы. Тыпалогія перакладаў. Прыёмы перакладу. Методыка правядзення перакладу.

## ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ

Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 1

Знайдзіце ў сказах памылкі, абумоўленыя парушэннямі норм беларускай літаратурнай мовы, і вызначце іх тып. На які нарматыўны дакумент вы будзеце абапірацца пры класіфікацыі памылак? Як адзначаюцца і выпраўляюцца гэтыя памылкі пры праверцы пісьмовых прац вучняў? Адрэдагуйце сказы.

*1. У канцы жніўня і ў пачатку верасня дзед збіраў падасінавікаў і баравікоў.*

*2. Толькі праз тры дні пасля аперацыі хворы пачаў адкрываць вочы.*

Кампетэнтнасна-арыентаванае заданне № 2

Знайдзіце ў сказах памылкі, абумоўленыя парушэннямі норм беларускай літаратурнай мовы, і вызначце іх тып. На які нарматыўны дакумент вы будзеце абапірацца пры класіфікацыі памылак? Як адзначаюцца і выпраўляюцца гэтыя памылкі пры праверцы пісьмовых прац вучняў? Адрэдагуйце сказы.

*1. Мясцовы хор наведваюць як маладыя маладзіцы, так і старэнькія бабулькі.*

*2. Каля мясцовага клубу ўжо сабралася многа народа.*

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
(прамежкавая атэстацыя)

| Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|
| ***10 (дзесяць) балаў*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;<br>поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай па вучэбнай дысцыпліне;<br>уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;<br>творчая самастойная работа на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***9 (дзевяць) балаў*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай па вучэбнай дысцыпліне;<br>сістэматычная, актыўная самастойная работа на практычных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***8 (восем) балаў*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ў аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>здольнасць самастойна вырашаць складаныя |

| | |
|---|---|
| | праблемы ў рамках вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>актыўная самастойная работа на практычных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***7 (сем) балаў*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>свабоднае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>самастойная работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***6 (шэсць) балаў*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя вывды;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>самастойная работа на практычных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***5 (пяць) балаў*** | дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць вывады;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>самастойная работа на практычных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, |

| | |
|---|---|
| | дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***4 (чатыры) балы*** | дастатковы аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны адказ на пытанні, уменне рабіць вывады без істотных памылак;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;<br>работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***3 (тры) балы*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны;<br>некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***2 (два) балы*** | фрагментарныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;<br>няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых памылак;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| ***1 (адзін) бал*** | адсутнасць ведаў і кампетэнцый у аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| Асновы псіхалогіі і педагогікі. Педагогіка | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | пратакол № ___ ад __.__.2025 г. |